галоўнага героя аповесці адбываецца ноччу, калі герой нібыта засынае, затым прачынаецца ад ціхага стуку Падземнага чалавека ў акно і адпраўляецца з ім у займальную вандроўку. У апошняй, шостай главе твора акажацца, што ўсё адбывалася з галоўным героем нібыта ў сне. Прачнуўшыся, ён моцна ўражаны ад таго, колькі шмат звестак ён даведаўся пра мінулае сваіх продкаў падчас сну, і ўжо цалкам па-новаму пачынае ўспрымаць рэчаіснасць. Дадзены сон якраз і сімвалізуе сон нацыі. Да таго часу, пакуль нацыя не прачнецца, яна не можа правільна ацаніць рэчаіснасць, якая, як акажацца, не такая простая, як яе могуць трактаваць тыя, каму выгадны гэты сон.

Несумненным з'яўляецца тое, што Вацлаў Ластоўскі здолеў заняць сваё адметнае месца ў гісторыі Беларусі не толькі як бліскучы літаратар, але і як сапраўдны прарок свайго часу, і вельмі добра, што яго творы ў перакладах, у тым ліку і балгарскіх, могуць паўплываць на свядомасць прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей, якім сугучны ідэі беларускага адраджэнца.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Антология белоруска проза / Съст. : Волга Ипатова. София : Илинда-Евтимов, 2005. С. 28–53.
2. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / рэдкал. : Гніламёдаў У. В., Жураўлёў В. П. [і інш]. Мінск : Беларуская навука, 1999–2003. Т. 1 : 1901–1920 / Гніламёдаў У. В. [і інш.]. 1999. 583 с.
3. Интерпретираме руска литература: сборник / Съст и ред. А. Вачева, Г. Петкова, Р. Парашкевов; научна ред. Р. Божанкова. София : СУ «Св. Климент Охридски», 2018.
4. Ластоўскі В. Ю. Творы. Мюнхэн : Выдавецтва «Бацькаўшчыны», 1956. 112 с.
5. Ластоўскі В. Ю. Лабірынты. Мінск : Попурри, 2015. 173 с.
6. Марчевски М. Белоруска литература // Литературен свят. 2012. № 41 [Электронный ресурс]. Рэжым доступу : http://literaturensviat.com/?p=59325/. Дата доступу : 24.02.2019.



## Собаль П. А., Кіслейка Л. С. (Мінск)


## Малая радзіма ў творчасці Аркадзя Нафрановіча

*Маленькая мая Радзіма*
*Заўсёды ты перад вачыма,*
*І думкаю, і сэрцам я з табой.*
*Прыеду і сумую ў хаце,*
*І чую ціхі голас над сабой:*
*Спявае калыханку маці…*

Тэма малой радзімы блізкая кожнаму чалавеку. Творчыя асобы, у прыватнасці пісьменнікі, так ці інакш закранаюць свае вытокі ў творчасці, асэнсоўваюць іх лёсавызначэнне. Невыпадкова такія прывабныя нам і сёння творы беларускіх класікаў, прысвечаныя родным

прасторам. Кожны гарадок, вёска і куток па-свойму ўнікальныя і непаўторныя. У выніку даследчых работ з’яўляюцца новыя разнапланавыя выданні, якія прыадкрываюць невядомыя старонкі гісторыі родных мясцін, выклікаюць цікавасць да неардынарных асоб.

Мэта нашага даследавання – выяўленне вобразаў малой радзімы ў творчасці Аркадзя Нафрановіча. Актуальнасць работы вызначаецца тым, што Аркадзь Нафрановіч – гэта самабытны беларускі пісьменнік, творчасць якога, амаль поўнасцю прысвечаная малой радзіме, мала даследавана. Аб’ектам вывучэння з’яўляюцца вобразы малой радзімы ў творчасці Аркадзя Нафрановіча. Крыніцай для даследавання выбрана грамадска-патрыятычная лірыка Аркадзя Нафрановіча.

Задачы даследавання: а) раскрыць асноўныя этапы жыцця і творчасці Аркадзя Нафрановіча; б) выявіць і раскрыць вобразы малой радзімы ў творчасці Аркадзя Нафрановіча; в) зацікавіць творчасцю Аркадзя Нафрановіча чытачоў.

Вынікі і матэрыялы працы могуць быць выкарыстаны настаўнікамі пры вывучэнні аглядавых тэм па сучаснай беларускай літаратуры, на пазакласных мерапрыемствах, прысвечаных малой радзіме.

З самага першага зборніка тэма роднага краю становіцца «візіткай» творчасці Аркадзя Нафрановіча, вядомага не толькі на сваёй малой радзіме – Пастаўшчыне і Мядзельшчыне.

Аркадзь Іосіфавіч Нафрановіч нарадзіўся ў вёсцы Юшкавічы на Мядзельшчыне. Былы непаўналетні вязень фашысцкіх канцлагераў. Пасля заканчэння сямігодкі вучыўся ў педагагічным вучылішчы. Служыў у арміі. Закончыў геаграфічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Працаваў настаўнікам: выкладаў геаграфію, гісторыю, музыку ў школах Мядзельскага і Пастаўскага раёнаў.

Аркадзь Нафрановіч належаў да паэтаў-самавукаў. У 1998 г. быў прыняты ў Саюз пісьменнікаў Беларусі. Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Уладзіміра Караткевіча. Узнагароджаны Памятным знакам «2000 год хрысціянству».

Акрамя паэтычнага таленту, прырода шчодра адарыла Аркадзя Іосіфавіча выключнымі музычнымі здольнасцямі: ён іграў на акардэоне і цудоўна спяваў. Прымаў удзел Аркадзь Іосіфавіч у конкурсе прыпевак, абвешчаных газетай «Звязда», і стаў фіналістам конкурсу.

Жыццёвы шлях Аркадзя Нафрановіча закончыўся 15 сакавіка 2015 года. Аднавяскоўцы ўшаноўваюць памяць аб сваім выдатным земляку, які праславіў родныя мясціны. Кожную апошнюю нядзелю красавіка (нараджэнне Аркадзя Іосіфавіча) ў Камайскім касцёле праходзіць ушанаванне яго памяці. На верш Нафрановіча «Малітва» пакладзена

музыка арганісткай Аленай Бярнардаўнай Даўжук. Твор гучыць пад музыку аргана.

На доме, дзе жыў Аркадзь Нафрановіч, устаноўлена мемарыяльная дошка. Стаіць пытанне аб назве вуліцы ў Камаях у яго гонар.

Бязмежная любоў да цудоўнага нарачанскага краю захавалася ў сэрцы Аркадзя Нафрановіча на ўсё жыццё і натхніла на стварэнне прасякнутых лірызмам і вобразнасцю ўзнёслых вершаў, аб’яднаных у зборнікі паэзіі «Мядзельскі мерыдыян», «Святло Нарачы».

*Родны край мой, плыві ў квецень,*
*Хай тваё жыццё крыніцай б’е.*
*І калі я нешта значу ў свеце,*
*Гэта шчасце- толькі праз цябе* [8, с. 30].

Паэт успрымае нарачанскую зямлю «божым дарам», а сябе параўноўвае сярод гэтай красы з «коласам у жытнёвым моры». Акраверш «Азёрны кут, як божы дар…», прысвечаны краявідам Паазер’я.

*Азёрны кут, як божы дар:*
*Рабін кастры на сконе года,*
*Крыніц гаючая вада,*
*Аеру непаўторны водар.*
*Дубок з бярозкай пад акном,*
*Зялёных дываноў узоры.*
*І я сярод красы такой,*
*Як колас у жытнёвым моры* [1, с. 9].

Нямала вершаў са зборнікаў прысвечана гораду Мядзелу і яго ваколіцам: «Мой Мядзел», «Мой горад», «Мядзельскі мерыдыян» і іншыя.

Паэт з асаблівым пачуццём адносіўся да мясцін, дзе пахаваны яго бацькі, дзе жывуць яго родныя, гэта месца, куды яму заўсёды хочацца вяртацца, дзе яго заўсёды чакаюць.

*І з далёкіх, і з блізкіх дарог*
*Вечна ў Мядзел спяшаюся родны,*
*Як калісь на бацькоўскі парог,*
*Да матулінай мовы лагоднай* [8, с. 14].

Сталае жыццё Аркадзя Іосіфавіча звязана з Пастаўшчынай, куды пасля заканчэння Лепельскага педвучылішча па размеркаванні паехаў працаваць. Спачатку ў вёску Янкішкі, а потым у вёску з пявучай назвай Камаі, дзе і пражыў да канца сваіх дзён.

Пастаўшчыне Аркадзь Нафрановіч прысвяціў паэму «Горад музыкі і сонца» (2009), якая выйшла асобным зборнікам. Паэма складаецца з 10 раздзелаў, у якіх паэт расказвае пра сам горад, яго жыццё, яго гісторыю, апісвае традыцыі, славутасці Пастаў.

*ПАСТАВЫ – ужо шэсць вякоў*
*Гучыць гэта слова над светам.*

*У ім і людская любоў,*
*І ўзрушаны голас паэтаў,*
*І водгук далёкіх падзей,*
*І радасць набыткаў, і слава…*
*Да сонца – вышэй і вышэй! –*
*Імкнуць вечна нашы ПАСТАВЫ* [2, с. 1].

На словы Аркадзя Нафрановіча, а музыку Леаніда Захлеўнага напісаны гімн горада Паставы, і не адно свята горада не абыходзіцца без гэтага гімна.

Для Аркадзя Нафрановіча Радзіма – гэта не толькі родная зямля, куток, дзе нарадзіўся, а і людзі, яго землякі. Ім прысвечаны цэлы цыкл вершаў «Я помню вас, мае землякі», «Святар і паэт», «Санет» і іншыя.

*Дарагія мае землякі,*
*Людзі мядзельскай слаўнай старонкі,*
*Поціск вашай сяброўскай рукі,*
*Добры погляд і гумар ваш тонкі*
*Як бальзам на душу мне яны.*
*Толькі дома такое магчыма.*
*Срэбрам Нарачы, звонам сасны*
*Тут мяне сустракае радзіма* [1, с. 15].

У сваіх успамінах Аркадзь Нафрановіч піша, што настаўнікам у Лепельскім педвучылішчы быў Мікола Пятрэнка, яго зямляк, аўтар многіх песень, у тым ліку музыкі на верш Веры Вярбы «Ручнікі». «Сышліся музыка і слова», – пад такой назвай напісаў Аркадзь Нафрановіч верш пра сваё творчае сяброўства.

*Сышліся разам музыка і слова,*
*Жыве ў сэрцы локця пачуццё.*
*У Полацку над вуліцай Свярдлова*
*Лунаюць песні – славіцца жыццё* [1, с. 23].

Дзякуючы плённаму супрацоўніцтву паэта і кампазітара, выйшаў зборнік «Мелодыі роднага краю» (1995), у які ўвайшлі 17 песень і рамансаў, прысвечаных малой радзіме.

Асобна неабходна сказаць пра зборнік нарысаў і вершаў «Сейбіты дабра і мудрасці», які аўтар прысвяціў нялёгкай працы настаўнікаў-землякоў і пісаў, што «гэта кніга – мая ажыццёўленая мара».

*Настаўнік, у роднай старонцы*
*З табой я пазнаць столькі змог!*
*Вышэй за цябе – толькі сонца,*
*Мудрэй за цябе – толькі Бог* [9, с. 3].

Год роднай зямлі стаў годам пазнання багатай і загадкавай гісторыі нашай краіны. З кожным днём мы адкрываем для сябе людзей беларускай зямлі, якія праслаўляюць сваю маленькую радзіму.

Беларусь па праву можа ганарыцца славутымі песнярамі, якія апявалі і праслаўлялі сваю маленькую радзіму. Пастаўшчына

і Мядзельшчына ж могуць ганарыцца сваім сынам Аркадзем Нафрановічам, які не толькі сваёй творчасцю яшчэ раз уславіў гэты незвычайны куточак Беларусі, стаў для яго самабытным паэтам, але і ўнёс вялікі уклад у яго развіццё і працвітанне.

Аналізуючы зборнікі Аркадзя Нафрановіча, мы прыйшлі да высновы, што вобраз малой радзімы праходзіць праз усю творчасць паэта. Зборнік «Святло Нарачы» і «Мядзельскі мерыдыян» прысвечаны Мядзельшчыне. Зборнік «Горад музыкі і сонца» апявае прыгажосць Пастаўшчыны. У гэты зборніках паэт захапляецца прыродай роднага краю, з любоўю і павагай паказвае сваіх землякоў, тыя мясціны, дзе ён нарадзіўся і пражыў жыццё.

У час даследавання мы наведалі мясціны, дзе нарадзіўся і жыў Аркадзь Нафрановіч. Сустрэліся з яго сынам, Валерыем Аркадзьевічам Нафрановічам.

Цёплая сустрэча адбылася ў вёсцы Крывічы і з былым аднакурснікам і сябрам Аркадзя Іосіфавіча Францам Ульянавічам Ракецкім.

Творчасць Аркадзя Нафрановіча была прыхільна ацэнена Максімам Танкам, Нілам Гілевічам, Леанідам Дранько-Майсюком, Генадзем Бураўкіным, Міколам Шабовічам**.** Ён актыўна супрацоўнічаў з Міколам Пятрэнка, Леанідам Захлеўным, што дае падставу сцвярджаць аб таленце паэта-песенніка.

На нашу думку, зварот да творчасці Аркадзя Нафрановіча, якая была ацэнена на дастойным узроўні беларускімі паэтамі, з’яўляецца актуальным, асабліва ў Год малой радзімы. Творчасць Аркадзя Нафрановіча з’яўляецца сведчаннем таго, што ў Беларусі шмат таленавітых людзей, якія мала вядомыя і якія заслугоўваюць нашай увагі.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. Нафрановіч А. І. Выбранае. Мінск : Кнігазбор, 2011.
2. Нафрановіч А. І. Горад музыкі і сонца. Маладзечна : Друкарня «Перамога», 2009.
3. Нафрановіч А. І. З дарог памяці. Мінск : Кнігазбор, 2007.
4. Нафрановіч А. І. Мая адысея. Мінск : Юнацтва, 2001.
5. Нафрановіч А. І. Мелодыі роднага краю. Полацк, 1995.
6. Нафрановіч А. І. Мядзельскі мерыдыян. Мінск : Ініс Софт, 1995.
7. Нафрановіч А. І., Лапушынскі У. У. Пяром удзячнасці і абавязку. Мінск : Выдавец Вараксін А. 2018.
8. Нафрановіч А. І. Святло Нарачы. Мінск : Мастацкая літаратура, 1998.
9. Нафрановіч А. І. Сейбіты дабра і мудрасці. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2007.
10. Нафрановіч А. І. У пошуках ісціны. Мінск : Беларускі кнігазбор, 2005.